УДК 94(476)

# ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ: ЗАХАВАЦЬ І АБАРАНІЦЬ (НАПЯРЭДАДНІ 80-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ)

**Р. Д. Галынскі**
Магілёўскі інстытут МУС Рэспублікі Беларусь,
старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін,
кандыдат гістарычных навук

***Анатацыя.*** *Гістарычная памяць — калектыўнае ўяўленне пра мінулае народа, адзін са сродкаў узаемасувязі пакаленняў. Самай яркай і вырашальнай гістарычнай падзеяй для беларускага народа была Вялікая Айчынная вайна.*
***Ключавыя словы:*** *Вялікая Айчынная вайна, гістарычная памяць, сувязь пакаленняў, помнікі, мерапрыемствы, папулярызацыя.*

***Annotation.*** *Historical memory is a collective perception of the people's past, one of the means of intergenerational communication. The most striking and decisive historical event for the belarusian people was the great patriotic war.*
***Keywords:*** *Great Patriotic War, historical memory, connection of generations, monuments, events, popularization.*

У кожнага народа ёсць сваё мінулае, і кожны з народаў імкнецца яго захаваць.

Беларусы, маючы шматвяковы гістарычны шлях развіцця дзяржавы і шматтысячагодняе гістарычнае мінулае, не з'яўляюцца выключэннем. Таму захаванне гістарычнай памяці — гэта адзін з нацыяўтваральных элементаў для беларускага народа.

Сам жа тэрмін «гістарычная памяць» абазначае від калектыўных уяўленняў, што можна звязаць з паняццем «калектыўная памяць». Гэта формы прысутнасці мінулага ў сучаснасці пры фарміраванні калектыўнай ідэнтычнасці. Гістарычная памяць — гэта падмурак культурнай пераемнасці, гэта нейкая выява мінулага, што транслюецца з пакалення ў пакаленне. Адной з самых яркіх, гераічных, выбітных і адначасова трагічных падзей у гісторыі нашага народа была Вялікая Айчынная вайна [1; 2]. Менавіта яна падзяліла жыццё ўсяго беларускага народа ў XX стагоддзі на «да» і «пасля». Канечне, былі і іншыя падзеі, такія як Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя, яднанне беларускага народа ў 1939 г., аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, спыненне існавання Савецкага Саюза і іншыя, але ж дата «1941–1945» на слыху ў кожнага нягледзячы на ўзрост.

Наша краіна імкнецца да захавання сваёй гісторыі, сваіх помнікаў і сваіх традыцый. Шматлікія заканадаўчыя акты па захаванні беларускай гістарычнай і культурнай спадчыны былі распрацаваны яшчэ ў часы СССР. Але ж сёняшні дзень дыктуе свае правілы і патрабуе больш дасканала бараніць сваё мінулае.

Бо мы бачым, як гісторыя пераўтвараецца ў ідэалагічную і палітычную зброю. Сёлета шмат у якіх краінах Еўропы вядзецца праца па «перапісванню» гісторыі і мінулага народаў і краін, вынішчаюцца ці дэфармуюцца разнастайныя факты, ствараюцца хлуслівыя інтэрпрэтацыі. Асабліва гэта тычыцца гісторыі XX стагоддзя і ў першую чаргу падзей, звязаных з Другой Сусветнай вайной, і ролі ў ёй СССР.

Веданне гісторыі мінулага сваёй краіны і яго папулярызацыя — вельмі важныя элементы патрыятычнага выхавання як моладзі у прыватнасці, так і нацыі ўвогуле. Гэта ўсё афіцыйна замацавана нават у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (ст. 15, ст. 54) [3]. Захаванне гістарычнай і культурнай спадчыны (як элементаў гістарычнай памяці) прапісана і ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры (гл. 16) [4].

На прыкладзе падзей Вялікай Айчыннай вайны, захаванні памяці аб ёй, мы прадэманструем праяву гістарычнай памяці беларусаў. Тым больш, што 2024 г. — гэта 80-я гадавіна вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У захаванні гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне Беларусь дэманструе сімвалічную пераемнасць з традыцыяй СССР. Там дамінаваў трыумфальны наратыў, гераічная тэматыка. Так і зараз: штогод мы святкуем з правядзеннем шэсцяў, мітынгаў і канцэртных праграм Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і дні вызвалення абласных і раённых цэнтраў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Акрамя таго, існуюць памятныя даты (Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, дні памяці спаленых вёсак і г. д.).

Варта адзначыць і перасячэнне беларускай гістарычнай памяці з агульнаеўрапейскім кантэкстам культуры памяці. Тут асноўнай кропкай сутыкнення з’яўляецца памяць пра Халакост і генацыд іншых народаў.

У нашай краіне праводзіцца і мемарыяльная палітыка, ахова месц пахаванняў, мемарыяльных комплексаў і г. д. Штогод ажыццяўляюцца «Вахты памяці» па пошуку, эксгумацыі і перапахаванню загінуўшых абаронцаў Айчыны і ахвяр фашызму. Шырока працуюць рэканструктарскія і патрыятычныя клубы (ГВГР «Апошні рубеж» (Магілёў) і інш.), здзяйсняюцца рэканструкцыі баёў («Бабруйскі кацёл», «Абарона Брэста» і г. д.).

У навучальных установах як звыклая практыка праводзяцца «сустрэчы пакаленняў», «урокі мужнасці» і г. д. Тут ідзе неапасродкаваны кантакт з удзельнікамі тых далёкіх падзей.

У сродках массавай інфармацыі штогод напярэдадні разнастайных памятных і святочных дат публікуецца шэраг матэрыялаў па разглядаемай тэматыцы.

У галіне сутыкнення патрыятычнага выхавання моладзі і мемарыялізацыі мінулага вельмі яскрава выглядаюць «моладзевыя стройкі» (Хатынь і Брэсцкая крэпасць). Штогод навучэнцы школ, сярэдніх прафесіянальна-тэхнічных і ўстаноў вышэйшай адукацыі праводзяць добраўпарадкаванне мясцін баявой і трудавой славы. Згаданыя мерапрыемствы нясуць у сабе і патрыятычнае выхаванне і перадачу культарнага і гістарычнага кода беларускага народа. Дадаткова згадаем пра традыцыю надання студэнцкім і піянерскім атрадам/дружынам і навучальным установам імёнаў Герояў Савецкага Саюза.

Асобным радком стаіць і кінематограф з мастацкай літаратурай, тут тэма гістарычнай памяці і тым больш падзей, звязаных з гадамі Вялікай Айчыннай вайны, выступае як «апазнавальны знак» беларускага мастацтва ў кантэксце сусветнага. У сферы культуры асобнай пазіцыяй стаяць краязнаўчыя раённыя, абласныя і рэспубліканскія музеі, амаль што ў кожным з іх маецца экспазіцыя, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне.

Неад’емным элементам нашай штодзённасці выступае нашая жыццёвая прастора, а менавіта урбаніміка. Тут мы сутыкаемся з назвамі вуліц, сквераў, праспектаў і г. д. Шмат з іх носяць імёны Герояў Савецкага Саюза з ліку землякоў, вызваліцеляў, знакамітых беларусаў, што ўнеслі ўклад у Перамогу (вуліцы Смалячкова, Надтачэева, Грышына, Іскаліева, Фаціна і г. д.). Акрамя таго, прысутнічае непасрэдная адсылка да подзвігу беларускага (шырэй — савецкага) народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны (праспект Пераможцаў, Партызанскі праспект, плошча Незалежнасці, плошча Перамогі і г. д.).

У цэлым жа, як нам бачна, палітыка захавання гістарычнай памяці ў Рэспубліцы Беларусь дазваляе пазбегнуць так званых войн памяці, што характэрны для шэрагу былых савецкіх краін і краін Цэнтральнай Еўропы. Трагедыя тых часоў моцна адбілася ў памяці нашага народа, таму робяцца ўсе намаганні па яе фіксацыі і недапушчэнні паўтора тых жудасных падзей. Больш таго, неабходнасць захавання гістарычнай памяці прапісана ў заканадаўчых актах краіны.

---

1. Аленькова Ю. В. Великая Отечественная война в исторической памяти белорусов // Итоги научных исследований ученых МГУ им. А. А. Кулешова 2019 г. : материалы науч.-метод. конф., 29 янв. – 10 февр. 2020 г. / под ред. Н. В. Маковской, Е. К. Сычовой. Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2020. С. 4–6.
Вернуться к статье

2. Аленькова Ю. В. Феномен культурной памяти : проблемы философско-культурологического осмысления // Итоги научных исследований ученых МГУ имени А. А. Кулешова 2017 г. : материалы науч.-метод. конф., 26 янв. – 8 февр. 2018 г. / под ред. Е. К. Сычовой. Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2018. С. 6–8.
Вернуться к статье

3. Конституция Республики Беларусь : с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г., 17 окт. 2004 г. и 27 февр. 2022 г. Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2023. 80 с. Вернуться к статье

4. Кодэкс Рэспулікі Беларусь аб культуры : 20 ліп. 2016 г., № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. : па стане на 06.02.2023 г. Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2023. 280 с. Вернуться к статье